Мы даем табе МАГЧЫМАСЦЬ

Адпачыць

- Цікава праводзіць вольны час і пазнаёміцца з файнымі дзяўчынамі і хлопцамі
- Адчуць сябе ўпэўнена ў калектыве, развіць сваё лідарскія здольнасці
- Знайсці новых сяброў і рэалізаваць свае ідэі разам з імі

Удасканаліць сябе

- Атрымаць дадатковую адукацыю ў Беларусі і за мяжой
- Развіць свае навыкі карыстання фота і відэатэхнікай
- Навучыцца фармуляваць і рэалізоўваць свае ідэі
- Паспрабаваць сябе ў ролі журналіста, дызайнера, арганізатара мерапрыемстваў

Падзяліцца сваімі ведамі з іншымі

- Апублікаваць свае артыкулы, творчыя працы, эсэ
- Рэалізаваць самыя смелыя ідэі
- Уплываць на лёс сваёй краіны

■ Падчас акцыі ў Дзень Дзіцяці. 1 чэрвеня 2007г.



Нашы партнеры:

Europejski Dom Spotkan – Fundacja Nowy Staw (Люблін, Польшча)
Youth4Media (Мюнстер, Нямеччына)
Беларускі нацыянальны моладзевы савет «РАДА»
Асамблея НДА (Менск, Беларусь)

Будзь разам з намі:

www.dzedzich.org • vk.com/dzedzich_berascie
Тэл.: +375-29-724-21-16 • E-mail: dzedzich@tut.by

ВАЛАНЦЁРСТВА Ў "ДЗЕДЗІЧЫ"

• УСЁ ПРА "ДЗЕДЗІЧ" • ПРА ВАЛАНЦЁРСТВА
• ПРА БОНУСЫ І ПЛЮШКІ

УДЗЕЛЬНІКІ ПРАЕКТА
"БІРЖА МОЛАДЗЕВЫХ ІНІЦЫЯТЫЎ - 2"
КАЗІМЕЖ ДОЛЬНЫ, ПОЛЬШЧА, ЛІПЕНЬ 2012

Зберагчы і павялічыць

Дзедзіч

АГЕНЦТВА
РЭГІЯНАЛЬНАГА РАЗВІЦЦЯ

"Дзедзіч" утвораны у 1999 годзе студэнтамі БрДУ.
З таго часу ў нас змянілася 6 пакаленняў валанцёраў.
Праз удзел у нашай дзейнасці прайшло больш за 500 маладых берасцейцаў.

Наша місія:
грунтуючыся на прынцыпах патрыятызму і павагі да беларускай культуры, імкнучыся да развіцця і самаўдасканалення, павышаць грамадзянскую актыўнасць моладзі Берасця шляхам правядзення асветніцкіх і адукацыйных праграм, масавых мерапрыемстваў і падтрымкі маладзёжных ініцыятыў.
Наш дэвіз: Зберагчы і павялічыць!

Задачы:
- Спрыяць развіццю беларускай культуры
- Падтрымліваць грамадскія ініцыятывы моладзі ў галіне адукацыі і культуры
- Спрыяць пашырэнню міжнародных кантактаў моладзі

■ Валанцёр Дзедзіча Наста Гурына падчас здымкаў відэаролікаў кампаніі "За вела-Брэст"



СТВАРАЕМ МАГЧЫМАСЦІ!

Нашы праграмы, дзе ТЫ можаш паўдзельнічаць у якасці валанцера:

Інфармацыйнае агенцтва "Dzedzich Week-News"
- Моладзевы бюлетэнь "Дзедзіч" (культурная, сацыяльная і маладзёжная тэматыка).
- Электронная рассылка Dzedzich week-news (навіны арганізацый Берасцейшчыны, аб'явы пра конкурсы, вандроўкі, стажыроўкі).
- Інтэрнэт-пляцоўка http://dzedzich.org, паблікі і групы ў сацыяльных сетках,
- PR – суправаджэнне дзейнасці арганізацыі.

Патрэбна дапамога: праца ў інтрэнэце, напісанне артыкулаў, фота і відэа, SMM.
Умовы ўдзелу: валоданне кампутарам, уменне пісаць, 2-хмесячная стажыроўка пры рэдакцыі "Дзедзіча".
Плюшкі: семінары па журналістыцы, стажыроўкі ў рэдакцыях СМІ Беларусі і замежжа, пункт у рэзюмэ (для тых, хто вырашыць працаваць журналістам), магчымасць карыстацца прафесійнай фота і відэа апаратурай.



Кампанія "Наша Мова"
- Сустрэчы з культурнымі дзеячамі
- Акцыі па папулярызацыі беларускай мовы і культуры
- Віктарыны, літаратурныя вечарыны, відэапрагляды

Патрэбна дапамога: арганізацыя і правядзенне сходаў і сустрэч, дызайн плакатаў і флаераў.
Умовы ўдзелу: узрост – ад 16 гадоў, пісьменнасць.
Плюшкі: сустрэчы з цікавымі людзьмі, прома-прадукцыя (майкі, магнідікі, кубкі і інш.).

Моладзевыя абмены (Беларусь і замежжа)
- Удзел у семінарах, летніках, стажыроўках у Беларусі і за мяжой
- Знаёмства з дзейнасцю іншых арганізацый краіны і свету

Патрэбна дапамога: афармленне віз, лагістыка.
Умовы ўдзелу: узрост – ад 16 гадоў, валоданне замежнай мовай (ангельская, нямецкая ці польская), камунікабельнасць.
Плюшкі: новыя знаёмствы і веды, магчымасць павандраваць бясплатна.

Еўрапейскі клуб
- Папулярызацыя еўрапейскіх каштоўнасцяў
- Інфармацыйная кампанія пра перспектывы Берасця ў Еўрапейскім саюзе

Патрэбна дапамога: збор і распаўсюджванне інфармацыі, праца ў інтэрнэце, арганізацыя конкурсаў і віктарын.
Умовы ўдзелу: Узрост - ад 18 гадоў, пісьменнасць, валоданне замежнай мовы, крэатыўнасць.
Плюшкі: Адукацыйныя і азнаямляльныя паездкі за мяжу, візавая падтрымка, новыя знаёмствы.

Экалагічны сектар
- Масавыя акцыі (прыборка смецця, ачыстка ракі Мухавец, пасадка дрэваў)
- Турыстычныя вандроўкі.

Патрэбна дапамога: распрацоўка маршрутаў, збор ўдзельнікаў, падрыхтоўка і арганізацыя мерапрыемстваў.
Умовы ўдзелу: узрост – ад 16 гадоў, турыстычныя навыкі (складванне намёта, распальванне вогнішча і г.д.), добрая фізічная падрыхтоўка, дысцыплінаванасць.
Плюшкі: знаёмствы з цікавымі людзьмі, культурны адпачынак, знаёмства з прыродай і культурай Беларусі.

Дом Еўрапейскіх Сустрэч
Дзедзіч вядзе будоўлю Дома Еўрапейскіх Сустрэч у вёсцы Залессе (Камянецкі р-н). Там ужо зараз можна праводзіць:
- Міжнародныя абмены, адукацыйныя семінары, культурныя імпрэзы, валанцёрскія летнікі.

Патрэбна дапамога: будаўнічыя і падсобныя працы, прыборка тэрыторыі, прыгатаванне ежы.
Умовы ўдзелу: узрост – ад 18 гадоў, фізічная падрыхтоўка, пазітыўны настрой, уменне працаваць у камандзе.
Плюшкі: авалоданне будаўнічымі спецыяльнасцямі, свежае паветра і фізічная нагрузка, новыя знаёмствы.

